Картаўцоў М. Д., студэнт 450 групы
дзённай формы навучання
Навуковы кіраўнік – Колабава І. Н.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

# ЗАРАДЖЭННЕ ОПЕРЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ
# (другая палова XVIII – 30-я гг. XX ст.)

Опера – імаверна адзін з самых шматгранных відаў тэатральна-музычнага мастацтва, які аб’ядноўвае сабой драматургію, музыку і харэаграфію. Першапачаткова ўзнікшая ў Італіі напрыканцы XVI ст. яна была спробай мастакоў з гуманістычнымі поглядамі адрадзіць антычную трагедыю. Беларуская опера – гэта адна з галоўных з’яў у гісторыі беларускай культуры і мастацтва, якая першапачаткова ўзнікла ў прыватнаўласніцкіх тэатрах магнатаў у другой палове XVIII ст, потым, дзякуючы смелым спробам аматараў-рамантыкаў у XIX ст., атрымала ўласныя нацыянальныя рысы і нарэшце ўзнялася на прафесійны ўзровень у 20-ыя – 30-ыя гг. XX ст.

З’яўленне опернага мастацтва ў Беларусі звязана з існаваннем прыватнаўласніцкіх прыгонных тэатраў. У першую чаргу, з Нясвіжскім тэатрам Радзівілаў. На пачатку 1780-х гг. уладар Нясвіжа Караль Станіслаў Радзівіл запрасіў да сябе на службу нямецкага кампазітара Ёгана (Яна) Давіда Голанда, каб той заняў пасаду дырыжора нясвіжскай капэлы. У Нясвіжы ён стварае дзве оперы – «Агатка, або прыезд пана» у трох актах і «Чужое багацце нікому не служыць» у двух актах. «Агатка» стала першай прафесійнай операй, што была пастаўлена ў Беларусі і мела вялікі ўплыў на далейшае развіццё музычнага мастацтва на нашых землях. Лібрэта для твора было напісана таленавітым літаратарам і

кампазітарам – Мацеем Радзівілам. Упершыню опера была пастаўлена 17 верасня 1784 г. у тэатры Нясвіжскага замка. Прымеркавана была дзея да прыезду ў горад Станіслава Панятоўскага. Аснова сюжэту оперы даволі простая. Агатака – прыгонная дзяўчына, якая кахае вясковага хлопца – Антака Цалку. Аднак гэтаму перашкаджае падстараста Піяшка, які жадае яе выдаць за другога хлопца – Антака Гайдака. І толькі мудры пан даруе галоўным героям шчасце. Опера скончваецца ўхваленнем справядлівага пана, правобразам якога быў Станіслаў Панятоўскі. «Агатка» мае антыпрыгонніцкі характар, які быў характэрны для твораў эпохі Асветы [**Ошибка! Источник ссылки не найден.**1, с. 133–134; 2, с. 229].

Другім оперным творам Голанда стала двухактавая опера «Чужое багацце нікому не служыць», пастаўленая між 1782–1785 гг. Ідэя ў ёй таксама разгортваецца вакол пары закаханых, якім перашкаджае бацька галоўнай гераіні, а канфлікт вырашаецца праз умяшанне падманнага «чарадзейства». Калі «Агатка» шчыльна звязана з мясцовымі рэаліямі, то другая опера Голанда ўжо больш «нейтральная»: яе дзеянне магло б адбыцца ў любой краіне і ў любы час. Аднак і гэты твор мае свае лакальныя прыметы. Напрыклад, імёны герояў – Кася і Янак, якія былі звычайны для тагачаснага сялянскага асяроддзя [3, с. 140–141; 4, с. 21].

Новым этапам у развіцці оперы ў Беларусі становяцца 1840-я гг. Звязана гэта з уплывам новай мастацкай плыні – рамантызмам, калі ў творцаў з’яўляецца цікавасць да народнай культуры і побыту. Важнай асобай таго часу стаў беларуска-польскі кампазтар Станіслаў Манюшка. У красавіку-траўні 1841 г. у Вільні была пастаўлена аднаактавая аперэтка на лібрэта Аскара Корвін-Мілеўскага «Латарэя», таксама вядомая як «Апошняя варшаўская латарэя». Ужо 8 верасня 1841 г. яе пабачылі ў Гродне, а праз два гады паставілі і ў Мінску [7, с. 360–361].

Таксама ў верасні 1841 г. Мінск пабачыў камічную оперу «Рэкруцкі габрэйскі набор» (да нашых дзён не захавалася), якая была пастаўлена ў гонар прыезду ў горад новага генерал-губернатара. Гэтая падзея стала вельмі знакавай тым, што стала першай спробай супрацы кампазітара і пачынаўшага тады пісаць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (які выканаў у ёй ролю старога габрэя – Іагана Бенатана) – першага класіка новай беларускай літаратуры. Гэтую падзею можна лічыць пачаткам беларускай оперы [3]. У 1840-я гг. імі ствараюцца і ставяцца аперэткі «Спаборніцтва музыкаў» і «Чарадзейная вада», якія не захаваліся.

Вяршыняй жа іх супрацы стала двухактная опера «Сялянка», лібрэта якой было напісана В. Дуніным-Марцінкевічам (таксама ён выканаў у ёй ролю войта Навума Прыгаворкі) на двух мовах – беларускай (беларускі тэкст быў надрукаваны лацінскім літарамі) і польскай. Надрукавана ў Вільні ў друкарні Юзафа Завадскага ў 1846 г. Музыка С. Манюшкі і К. Крыжаноўскага не захавалася. Упершыню яна была пастаўлена 9 лютага 1852 г. на сцэне Мінскага тэатру. Да нашых дзён дайшоў тэкст афішы: «*С дозволения начальства в субботу 9 февраля 1852 года будет представлена гг. любителями (в пользу бедных) опера в двух действиях на польском и простонародном языке, сочинения Викентия Мартинкевича с музыкою Монюшки, Крижановского и прочих под заглавием "Селянка"*» [7, с. 366]. У той жа дзень прыйшоў загад аб забароне спектакляў на «простонародном языке», але спектакль усё ж быў паказаны [6, с. 122]. На працягу 1853–1855 гг. оперу падпольна ставілі ў Бабруйску, Віцебску, Нясвіжы, Слуцку і Глуску [7, с. 366].

«Сялянка» мела вялікае значэнне для далучэння гледачоў да сцэнічнага мастацтва і абуджэння ў іх нацыянальнай самасвядомасці і

паўплывала на станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Важнасць гэтай оперы ў тым, што, дзякуючы ёй, упершыню са сцэны прагучала беларуская мова. Марцінкевіч выкарыстаў у оперы беларускія народныя песні і танцы [7, с. 149–150].

Пасля задушэння паўстання 1863 г. беларускае мастацтва пераходзіць збольшага ў ананімную плынь, а буйныя творы доўгі час не ствараюцца. Вяртанне оперы ў беларускую культурную прастору адбылося пасля стварэння БССР.

У 1922 г. Мікалай Чуркін стварае першую беларускую савецкую оперу «Вызваленне працы». У гэтым жа годзе сіламі аматараў яна была пастаўлена ў Мсціславе [7, с. 12]. Опера з’яўлялася спробай увасаблення ў савецкім оперным мастацтве тэмы класавай барацьбы. Опера да нашых дзён не захавалася, бо была згублена ў гады Вялікай Айчыннай вайны [5, с. 49].

У 1927 г. была створана камічная опера «Тарас на Парнасе» (лібрэта – Юл’ян Дрэйзін, музыка – Мікалай Аладаў). Як можна зразумець па назве, у аснову оперы была узята бурлескна-травесцыйная паэма Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе», але разам з гэтым была выкарыстана і «Энеіда навыварат» Вікенція Равінскага, якія лічацца класікай новай беларускай літаратуры [6, с. 50].

25 траўня 1933 г. у Мінску быў створаны Дзяржаўны тэатр оперы і балета, а 11 чэрвеня быў закладзены будучы будынак тэатра, будаванне якога скончылася ў 1938 г. Адной з галоўных сваіх задач тэатр лічыў стварэнне нацыянальнага рэпертуара. 10 сакавіка 1939 г. адбылася прэм’ера оперы кампазітара Яўгена Цікоцкага на лібрэта Петруся Броўкі «Міхась Падгорны». Тэматыка яе прысвечана жыццю сялянства ў перыяд Першай сусветнай вайны і кастрычніцкай рэвалюцыі, на фоне якіх развівалася гісторыя адносін двух закаханых – Міхася і Марысі [1].

28 жніўня 1939 г. ставіцца опера «У пушчах Палесся» кампазітара Анатоля Багатырова, па аповесці Якуба Коласа «Дрыгва» [1]. 20 кастрычніка 1939 г. з’яўляецца опера «Кветка шчасця» Аляксея Туранкова, што была пастаўлена на аснове сінтэтычнага спектакля Міхася Чарота «На Купалле» [1]. Усе гэтыя тры оперы былі прадстаўлены падчас дэкады беларускай культуры ў Маскве з 5 па 15 чэрвеня 1940 г. Паспяховае выступленне беларускіх артыстаў паўплывала на атрыманне оперным тэатрам прыстаўкі «Вялікі» [1].

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што беларуская опера – адна з важных з’яваў у гісторыі беларускага тэатральнага і музычнага мастацтва, стаўшая яскравай і ўнікальнай часткай нацыянальнай культуры.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Гісторыя тэатра [Электронны рэсурс] // Вялікі тэатр Беларусі. – Рэжым доступу: https://bolshoibelarus.by/bel/o-teatre-by/istoriya-teatra.html. – Дата доступу: 25.02.2024.

2. Дадзіёмава, В. У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя / В. У. Дадзіёмава. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2012. – 230 с.

3. Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч) [Электронны рэсурс] // Беларусь у асобах і падзеях. – Рэжым доступу: https://bis.nlb.by/by/documents/128300. – Дата доступу: 19.02.2024.

4. Зяневіч, У. К. Так адкрываліся далягляды : традыцыі і наватарства ў беларускай опернай і сімфанічнай музыцы 1920-х гадоў / Уладзімір Зяневіч // Мастацтва Беларусі. – 1987. – № 5. – С. 48–51.

5. Кавальчук, Н. М. Сюжэтныя матывы і оперныя сітуацыі ў нясвіжскіх творах Я. Голанда / Н. М. Кавальчук // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі : навукова-тэарэтычны часопіс. – 2005. – № 6. – С. 20–26.

6. Літвіноўская, Ю. І. Тэатральнае жыццё Беларусі ў XIX ст. / Ю. І. Літвіноўская // Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэд.: А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2019. – С. 120–123.

7. Скорабагатаў, В. І. Лібрэта опер Станіслава Манюшкі / склад. В. І. Скорабагатаў. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2020. – 376 с.

8. Трыгубка, І. У. Опера другой паловы XVIII ст. на славянскіх землях як адлюстраванне асветніцкіх ідэй і традыцый / І. У. Трыгубка // VIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 23-26 мая 2002 г.) : матэрыялы чытанняў / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры. – Мінск, 2003. – Ч. 2. – С. 226–232.